# НББ запрашае

## У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе некалькі тэматычных кніжных выстаў

Да 20 лістапада на трэцім паверсе кальцавога калідора дзейнічае выстава **"Сакрэты лічбавага мастацтва"**, арганізаваная ў рамках I Мінскага міжнароднага фестывалю лічбавага мастацтва "Terra Nova".

У экспазіцыі прадстаўлены папулярныя серыйныя выданні "100 % самоучитель", "Знания и опыт для экспертов", "Для дизайнеров", "Цифровое фото и видео". Наведвальнік знойдзе тут матэрыялы, што раскрываюць тэарэтычныя і практычныя асновы лічбавай фатаграфіі.

Шырока дэманструюцца выданні, прысвечаныя самай папулярнай праграме апрацоўкі фотаздымкаў "Adobe Photoshop". Выданні, што экспануюцца ў раздзеле "Лічбавыя тэхналогіі ў стварэнні відэафільмаў, кліпаў,ролікаў", дазваляюць паглыбіцца ў свет лічбавага відэа і пазнаёміцца са спосабамі прафесійнага стварэння рухомай графікі — відэаздымкай і відэамантажом. Асобным тэматычным блокам прадстаўлены кнігі пра сучасныя анімацыйныя тэхнікі: Macromedia Flash, трохмерную анімацыю (3DS), камбінаваную і пакадравую. У раздзеле "Мастацтва гуку" ўвазе наведвальнікаў прапануюцца практычныя матэрыялы па выкарыстанні камп'ютарных праграм у рабоце з гукам.

Аматары веб-дызайну знойдуць на выставе адпаведныя энцыклапеды, самавучыцелі і практычныя дапаможнікі. Матэрыялы па лічбавым мастацтве ў галіне дызайну рэкламы і друкаванай прадукцыі прадстаўлены ў раздзеле "Дызайн у рэкламе і паліграфіі". Нарэшце, арганізатары выставы не абышлі ўвагай і такі напрамак камп'ютарнага дызайну, як дызайн інтэр'ераў. Матэрыялы адпаведнага раздзела раскрываюць прыёмы архітэктурнага мадэлявання, з дапамагой якога можна хутка і якасна ствараць праекты.

Выстава будзе цікавай як прафесіяналам, так і "чайнікам", хто толькі пачынае спасцігаць сакрэты лічбавага мастацтва.

Да 30 лістапада на другім паверсе кальцавога калідора працуе выстава **"Шлях да сябе"**, прымеркаваная да Сусветнага дня псіхічнага здароўя (адзначаецца 10 кастрычніка). Экспазіцыя — своеасаблівы даведнік, практычны дапаможнік для тых, хто шукае шлях да поспеху і дабрабыту, да паўнацэннага, шчаслівага жыцця. Тут сабраны матэрыял пра найвялікшую загадку і таямніцу прыроды — чалавека. Самааналіз, самапазнанне, самаразвіццё, самавыхаванне, самаактуалізацыя — ключавыя словы выставы.

Сярод знакавых кніг, прадстаўленых у экспазіцыі, — выданні серыі "Мастера психологии", "Психологическая энциклопедия" і "Психология народной мудрости", творчыя біяграфіі знакамітых філосафаў, псіхааналітыкаў З.Фрэйда, К.Г.Юнга, Ф.Ніцшэ, Э.Фрома, М.Бярдзяева і іншых, вучэнні ўсходніх мысліцеляў Шры Аўрабінды, Шры Рамана Махаршы, Ошa.

У раздзелах "Псіхалагічны факультэт" і "Сам сабе псіхолаг" чытачам прапануюцца канцэнтрат эфектыўных, правераных практыкай метадаў і псіхатэхналогій, а таксама тэстаў на выяўленне рэсурсаў кожнага, хто імкнецца рэалізаваць сябе ў сённяшнім складаным жыцці.

У раздзеле "Тэхналогія цудаў" прадстаўлены найбольш эфектыўныя тэхнікі сучаснага напрамку практычнай псіхалогіі — НЛП (нейралінгвістычнага праграмавання).

Пытанням духоўнага самаўдасканалення прысвечаны раздзел экспазіцыі "Што хавае глыбіня?". Выданні, сабраныя ў ім, адкрываюць чалавеку мноства шляхоў да здароўя і шчасця. Пранікнуць у таямніцы ўласнай падсвядомасці, пазнаць метады псіхаэнергетычнай трэніроўкі, знайсці ключ, які адчыняе замкі дзвярэй да фізічнага здароўя, эмацыянальнай раўнавагі і духоўнай чысціні, чытачы змогуць дзякуючы гэтым кнігам. Тут ёсць ілюстраваныя дапаможнікі па хатха-ёзе, вучэнні Агні-Ёгі, тэхніцы ўнутранага цэнтравання — дзэн. Гэтыя выданні навучаць кіраваць чакрамі, дапамогуць авалодаць практычным курсам медытацыі.

* * *

Таксама да 30 лістапада дзейнічае прымеркаваная да Дня работнікаў культуры выстава **"Культура Беларусі: традыцыі і перспектывы"** (другі паверх кальцавога калідора). У экспазіцыі прадстаўлена больш за 100 дакументаў: даведачныя і энцыклапедычныя выданні, вучэбныя дапаможнікі, манаграфіі, зборнікі артыкулаў, альбомы, буклеты па гісторыі і сучасным стане культуры Беларусі. Матэрыялы размешчаны па наступных раздзелах: "Славутыя імёны", "Горадабудаўніцтва і архітэктура", "Выяўленчае мастацтва і народныя промыслы", "Музычная культура Беларусі", "Тэатральнае мастацтва" і "Захавальнікі спадчыны". Пачэснае месца адведзена шматтомнаму выданню беларускага вучонага Яўхіма Фёдаравіча Карскага "Беларусы", якое прызнана "найвышэйшым дасягненнем еўрапейскай славістыкі канца XIX — пачатку XX стагоддзя, энцыклапедыяй беларусазнаўства".

**Падрыхтаваў Міхал КАСЦЮЧЫК.**